


## § 1. Сацыяльна-эканамічная геаграфія свету, прадмет і задачы ў забеспячэнні ўстойлівага развіцця



***Успамінаем.*** Хто з навукоўцаў першым выкарыстаў тэрмін «геаграфія»? Чаму карту называюць «альфай і амегай» геаграфіі? Чаму геаграфія мае права называцца самастойнай навукай?



***Для чаго мы гэта вывучаем?*** Чаму сучаснаму чалавеку настолькі неабходныя веды ў галіне сацыяльна-эканамічнай геаграфіі? Выкажыце здагадку, як адсутнасць ведаў па геаграфіі можа перашкаджаць развіццю эканомікі дзяржавы. Ці ўзрастае роля геаграфіі як навукі ва ўмовах глабалізацыі?

**Прадмет і задачы сацыяльна-эканамічнай геаграфіі свету.** Кожная навуковая дысцыпліна ўносіць свой уклад у фарміраванне нашых уяўленняў аб свеце. Сацыяльна-эканамічная геаграфія свету (СЭГ свету) з'яўляецца адной з найцікавейшых геаграфічных дысцыплін, таму што толькі яна дазваляе адначасова адказаць на тры пытанні аб любой тэрыторыі або краіне: якія маюцца рэсурсы, чым характарызуецца насельніцтва і як развіваецца гаспадарка. А калі да атрыманага адказу дадаць гістарычныя веды і геаграфічнае мысленне, можна зрабіць прагноз дэмаграфічнай і сацыяльна-эканамічнай будучыні краіны.

Сацыяльна-эканамічная геаграфія свету — гэта галіна навукі, якая вывучае геаграфічныя заканамернасці развіцця насельніцтва, сусветнай гаспадаркі і светагаспадарчых сувязей, працэсаў на палітычнай карце свету або ў цэлым тэрытарыяльную арганізацыю грамадства ў свеце і асобных краінах у розных рэгіёнах планеты. Таму ***прадметам вывучэння*** сацыяльна-эканамічнай геаграфіі свету з'яўляюцца: дынаміка палітычнай карты свету, працэсаў, звязаных з вывучэннем геаграфіі насельніцтва; узаемаабумоўленасць прыродных рэсурсаў, гаспадаркі і грамадства; прасторава-часавыя заканамернасці дынамікі сектараў сусветнай гаспадаркі.

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Спецыфічная асаблівасць сацыяльна-эканамічнай геаграфіі свету — гэта тое, што яна вывучае свае аб'екты пад пунктам гледжання іх тэрытарыяльнай арганізацыі, г. зн. узаемаразмяшчэння, узаемадзеяння, узаемадапаўнення і кіравання. У гэтым заключаецца яе прыкладная значнасць.

Ва ўмовах глабалізацыі і пераходу да постындустрыяльнай стадыі перад сацыяльна-эканамічнай геаграфіяй свету стаіць шырокі пералік задач (мал. 1).

1. Вывучэнне фактараў змен на палітычнай карце свету

2. Тлумачэнне геаграфіі палітычных канфліктаў, асаблівасцей геапалітычных працэсаў

3. Комплекснае вывучэнне ў геаграфіі насельніцтва фактараў развіцця, дэмаграфічных працэсаў і працэсаў расселення

4. Вывучэнне асноўных фактараў і дынамікі развіцця сусветнай гаспадаркі

5. Комплекснае вывучэнне мінеральна-сыравінных рэсурсаў, фактараў размяшчэння і геаграфіі сектараў сусветнай гаспадаркі

6. Тлумачэнне эколага-арыентаваных змен у структуры сусветнай гаспадаркі і пераходу да постындустрыялізацыі

Мал. 1. Асноўныя задачы сацыяльна-эканамічнай геаграфіі свету

Эканоміка-геаграфічнае вывучэнне краін, або краіназнаўства, у цяперашні час становіцца ўсё больш гарманічнай часткай трох асноўных аб'ектаў СЭГ свету — палітычнай карты свету, насельніцтва і сусветнай гаспадаркі.

**Уклад вядомых вучоных у развіццё сацыяльна-эканамічнай геаграфіі свету.** Кожная навука ганарыцца імёнамі навукоўцаў, даследчыкаў, якія сваёй працай фарміруюць яе сусветны і грамадскі імідж. На працягу многіх стагоддзяў сфарміраваліся нацыянальныя навуковыя школы эканамічнай геаграфіі: нямецкая, французская, брытанская, расійская, амерыканская, беларуская і інш. Мы пазнаёмімся з навукоўцамі, якія ўнеслі найбольш значны ўклад у разуменне тых пытанняў, якія вам трэба будзе засвоіць у час вывучэння вучэбнага прадмета «Геаграфія. Сацыяльна-эканамічная геаграфія свету».



Мал. 2. В. М. Тацішчаў (1686–1750)

Уласнае бачанне сацыяльна-эканамічнай геаграфіі свету як навуковы напрамак, які вывучае прыроду, насельніцтва і гаспадарку ва ўзаемнай абумоўленасці і ўзаемазалежнасці, выклаў у сваіх працах расійскі вучоны В. М. Тацішчаў (мал. 2). Ён даказаў практычную значнасць геаграфіі для «ваеннага і земскага кіравання». Гэта думка пацвярджаецца

Правообладатель Адукацыя і выхаванне



Мал. 3. М. В. Ламаносаў (1711–1765)



Мал. 4. М. М. Баранскі (1881–1963)



Мал. 5. Ю. Г. Саушкін (1911–1982)

запатрабаванасцю сучаснай сацыяльна-эканамічнай геаграфіі ў практыцы рэгіянальнага кіравання.

Аб узаемасувязі прыродных і эканамічных з'яў, насельніцтва, гаспадаркі краін і фактараў размяшчэння прадукцыйных сіл пісаў вядомы рускі навуковец М. В. Ламаносаў (мал. 3). Яго ўклад у развіццё сацыяльна-эканамічнай геаграфіі свету заключаецца таксама ў доказе неабходнасці вывучэння насельніцтва як крыніцы «магутнасці дзяржавы», прычын скарачэння колькасці насельніцтва і прыняцця мер, якія б спрыялі яе росту.

Аб неабходнасці вывучэння сацыяльна-эканамічнай геаграфіі на розных тэрытарыяльных узроўнях упершыню было сказана ў працах выдатнага савецкага эканомікагеографа М. М. Баранскага (мал. 4). Распрацоўка паняцця «геаграфічны падзел працы» і асноў краіназнаўства таксама належыць гэтаму навукоўцу.

Прынцыпы прыродна-гаспадарчага раяніравання і геаграфічнага прагназавання сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны былі распрацаваны вядомым савецкім эканомікагеографам Ю. Г. Саушкіным (мал. 5) разам з яго іншымі шматлікімі навуковымі адкрыццямі.

**Свет і Беларусь.** Успомніце з вучэбнага курса 9-га класа «Геаграфія Беларусі» імёны беларускіх навукоўцаў-эканомікагеографаў і раскажыце аб іх укладзе ў развіццё сацыяльна-эканамічнай геаграфіі.

**Месца сацыяльна-эканамічнай геаграфіі ў сістэме навук.** Сацыяльна-эканамічная геаграфія свету пашырае і паглыбляе веды аб свеце як складанай сацыяльнай, эканамічнай, палітычнай, культурнай і экалагічнай сістэме, цесна ўзаемадзейнічаючы са многімі навукамі.

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

***У свеце ўсё ўзаемазвязана.*** З якімі навукамі сацыяльна-эканамічная геаграфія мае найбольш цесныя сувязі? Прывядзіце прыклады, якім чынам звязаны паміж сабой GPS-навігатар і геаграфія.

Сацыяльна-эканамічная геаграфія знаходзіцца ў цесным кантакце з фізічнай геаграфіяй і картаграфіяй. Яна звязана са многімі напрамкамі *фізічнай геаграфіі* — кліматалогіяй, гідралогіяй, метэаралогіяй, глебазнаўствам, біягеаграфіяй і інш. Напрыклад, без ведаў фізічнай геаграфіі аб тэктанічнай будове, прыродных умовах, кліматычных і глебавых асаблівасцях тэрыторыі або краіны немагчыма растлумачыць заканамернасці размяшчэння карысных выкапняў, спецыялізацыю і геаграфію сельскай гаспадаркі, галіновую структуру і геаграфію прамысловасці і інш.

Выкарыстоўваючы *картаграфічныя спосабы* малюнка розных аб'ектаў, СЭГ свету распрацоўвае картаграфічныя мадэлі развіцця розных галін гаспадаркі.

Гістарычны падыход пры вывучэнні палітычнай геаграфіі, насельніцтва, галін сусветнай гаспадаркі выступае адным з асноўных пры тлумачэнні сучасных працэсаў, якія адбываюцца. Таму СЭГ свету цалкам абапіраецца на сувязі з *гісторыяй*.

Пры вывучэнні насельніцтва той ці іншай краіны неабходна ведаць вялікі пералік дэмаграфічных паказчыкаў. Для гэтага сацыяльна-эканамічная геаграфія свету на працягу ўсёй гісторыі звяртаецца да *дэмаграфіі*.

Цесныя сувязі склаліся ў СЭГ свету з *эканомікай*. Напрыклад, без ведання паказчыкаў эканамічнага развіцця, знешняга гандлю, маштабаў вытворчасці нельга зрабіць дакладны аналіз тэрыторыі або краіны па ўзроўні сацыяльна-эканамічнага развіцця, вызначыць гаспадарчую спецыялізацыю, таварную і геаграфічную структуру гандлю. У даследаваннях аб'ектаў лакальнага, рэгіянальнага і нацыянальнага ўзроўняў сацыяльна-эканамічная геаграфія ўзаемадзейнічае з *рэгіянальнай эканомікай*.

У апошнія гады XX ст. умацавалася сувязь эканамічнай і сацыяльнай геаграфіі з *экалогіяй*. Гэта дазваляе па-новаму падысці да вырашэння тэрытарыяльных праблем рацыянальнага прыродакарыстання і аховы навакольнага асяроддзя.

**Асноўныя напрамкі сацыяльна-эканамічнай геаграфіі свету.** Традыцыйнымі напрамкамі сацыяльна-эканамічнай геаграфіі свету з'яўляюцца палітычная геаграфія, геаграфія насельніцтва і геаграфія сусветнай гаспадаркі, якая, у сваю чаргу, падзяляецца на геаграфію сельскай гаспадаркі, геаграфію прамысловасці і геаграфію сферы паслуг.

Аднак гэтыя тры асноўныя напрамкі развіваюцца ў цяперашні час у новых умовах. Для іх характэрныя рэгіянальныя канфлікты ў свеце, бурнае развіццё навукі і тэхналогій, дэмаграфічны пераход і постындустрыяльныя тэндэнцыі, транснацыяналізацыя і глабалізацыя. Дадзеныя працэсы адбываюцца ў сусветнай гаспадарцы настолькі

Правообладатель Адукацыя і выхаванне




Мал. 6. Новыя напрамкі сацыяльна-эканамічнай геаграфіі свету

маштабна ў XXI ст., што змяняюць звыклую структуру СЭГ свету. Гэта прыводзіць да з’яўлення новых напрамкаў у яе структуры (мал. 6).

**Роля СЭГ ва ўмовах глабалізацыі і ў забеспячэнні ўстойлівага развіцця.** На пачатку XXI ст. сацыяльна-эканамічная геаграфія стала найважнейшай і найбольш дынамічнай з геаграфічных навук, якія маюць вялікае практычнае значэнне для аптымізацыі размяшчэння грамадства, удасканалення тэрытарыяльнай арганізацыі гаспадаркі і інш.

Ва ўмовах глабалізацыі і значных змен у геаграфіі насельніцтва і сусветнай гаспадаркі пашырыўся сацыяльна-эканамічны заказ геаграфічнай навуцы. Практычная значнасць СЭГ выходзіць на першы план.

У цяперашні час эканомікагеографы ўдзельнічаюць у вырашэнні найважнейшых пытанняў менеджменту тэрытарыяльнага развіцця (мал. 7).

Эканомікагеографы ажыццяўляюць сацыяльна-эканамічнае раяніраванне краіны, вылучаюць рэгіёны, іх межы, аналізуюць структуру і функцыі гаспадаркі, прымаюць актыўны ўдзел у распрацоўцы прагнозаў і праграм сацыяльна-эканамічнага развіцця тэрыторый. Яны таксама ўдзельнічаюць у распрацоўцы нацыянальных стратэгій устойлівага сацыяльна-эканамічнага развіцця.

Правообладатель Адукацыя і выхаванне




Мал. 7. Практычнае значэнне сацыяльна-эканамічнай геаграфіі

**Свет і Беларусь.** Рэспубліка Беларусь адна з першых на постсавецкай прасторы ў 1997 г. распрацавала Нацыянальную стратэгію ўстойлівага развіцця (НСУР) на перыяд да 2010 г. Пасля яе рэалізацыі былі распрацаваны НСУР на перыяд да 2020 і да 2030 гг. У цяперашні час распрацоўваецца праект новай стратэгіі да 2035 г. У распрацоўцы ўсіх стратэгій удзельнічалі вядучыя навукоўцы-эканомікагеографы Беларусі, у тым ліку з Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта.

Такім чынам, выхад у практыку гаспадарчага планавання стаў адметнай рысай сучасных эканоміка-геаграфічных даследаванняў.

**Падвядзём вынікі.** Сацыяльна-эканамічная геаграфія вывучае ... . Асноўнымі напрамкамі развіцця сацыяльна-эканамічнай геаграфіі з'яўляюцца ... . Ва ўмовах глабалізацыі роля геаграфічнай навукі пастаянна ўзрастае, паколькі ... .

Сацыяльна-эканамічная геаграфія мае вялікае практычнае значэнне для аптымізацыі размяшчэння грамадства і ўдасканалення тэрытарыяльнай арганізацыі гаспадаркі.

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

П$_1$

***Праверым свае веды.*** 1. Што з'яўляецца прадметам сацыяльна-эканамічнай геаграфіі свету? 2. Якія новыя навуковыя напрамкі ў ёй вылучаюцца і з чым гэта звязана? 3. У чым заключаецца практычнае значэнне сацыяльна-эканамічнай геаграфіі ў сучасным свеце?

***Ад простага да складанага.*** Складзіце схему «Сувязь сацыяльна-эканамічнай геаграфіі з іншымі навукамі».

***Падарожжа па Глабальнай сетцы.***
Сайт факультэта геаграфіі і геаінфарматыкі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта.

Сайт Беларускага геаграфічнага таварыства.

Карты Google.

Правообладатель Адукацыя і выхаванне